участия заинтересованной общественности в предварительной оценке. Но каждая сторона обеспечивает, чтобы ее выводы своевременно доводились до сведения общественности посредством либо официальных извещений, либо других соответствующих средств, таких, как электронные средства информации [3, п. 8-12; 4, ст. 5]. Отсутствие данного правила в национальном законодательстве следует признать его недостатком, так как это не способствует доступу общественности к экологически значимой информации и возможности ознакомиться с результатами предварительной оценки.

Специфика определенных сфер также может оказывать влияние на избирательность при определении круга объектов, подлежащих СЭО. Она не проводится для проектов стратегий и программ, связанных с национальной обороной, чрезвычайными ситуациями и радиационной безопасностью населения [2, ст. 6]. В данном контексте имеются отличия от Протокола по СЭО, соответствующие положения которого представляются более разумными с позиции природоохранного фактора, так как позволяют включить в сферу СЭО больший круг стратегической документации. Так, в международном документе, делается исключение для планов и программ касающихся национальной обороны или чрезвычайных ситуаций в гражданской сфере, и такое исключение не указывается для программной документации, связанной с радиационной безопасностью населения. Отмеченные сферы должны являться единственной целью данных планов и программ (специально для ни разрабатываться), а не просто содержаться наряду с другими направлениями.

**Список использованной литературы**


1. Об охране окружающей среды [Электронный ресурс] : Закон Респ. Беларусь, 26 нояб. 1992 г., № 1982-XII : с изм. и доп. // Эталон-Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2022.

2. О государственной экологической экспертизе, стратегической экологической оценке и оценке воздействия на окружающую среду [Электронный ресурс] : Закон Респ. Беларусь, 18 июля 2016 г., № 399-З : с изм. и доп. // Эталон-Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2022.

3. Положение о порядке проведения стратегической экологической оценки, требованиях к составу экологического доклада по стратегической экологической оценке, требованиях к специалистам, осуществляющим проведение стратегической экологической оценки [Электронный ресурс] : постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 19 января 2017 г. № 47 : с изм. и доп. // Эталон-Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2022.

4. Протокол по стратегической экологической оценке к Конвенция об оценке воздействия на окружающую среду в трансграничном контексте. Киев. 2003 г. [Электронный ресурс] / - Режим доступа:https://unece.org/fileadmin//DAM/env/sea/eecca_capacity_r.htm – Дата доступа: 27.04.2022.

5. Мороз, О.В. Объекты стратегической экологической оценки в правовом контексте / О.В. Мороз // Проблемы управления. – № 3 (81). – 2021. – С. 124-130.


**УДК 94:321.01(476)**

***І. В. Нямкевіч***

(*Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны, Гомель*)

## ДА ПЫТАННЯ АБ ПАХОДЖАННІ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

*У артыкуле на аснове абагульнення сучасных поглядаў на праблему ўзнікнення першых гістрычных форм беларускай дзяржаўнасці прапанавана інтэграваная версія адпаведных*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*працэсаў. Зроблена выснова аб тым, што раннефеадальная дзяржаўнасць на Беларусі стваралася ў кантэксце працэсаў, характэрных для ўсёй Еўропы.*

Магчымасці і тэндэнцыі ўзаемадзеяння нацыянальных прававых сістэм дзяржаў ва ўмовах глабальнай і рэгіянальнай інтэграцыі ў значнай ступені абумоўленыя цывілізацыйнай прыналежнасцю гэтых дзяржаў. Межы і формы такой інтэграцыі неабходна вызначаць, "абапіраючыся на шматвяковую гісторыю развіцця беларускай дзяржаўнасці, культурныя і духоўныя традыцыі" [1, с.3]. У святле сказанага пытанне аб паходжанні беларускай дзяржаўнасці і яе гістарычных вытоках набывае дадаковы актуальны аспект.

Першае тысячагоддзе было эпохай узнікнення дзяржаўнасці ў нашым рэгіёне Еўропы. На змену племяннной арганізацыі публічнай улады прыходзіць новы яе тып – раннефеадальныя дзяржавы на чале з князямі. Пытанне вызначэння дакладнага часу ўзнікнення дзяржаўнасці ва ўсходніх славян застаецца дыскусійным. Існуе некалькі канцэпцый яе паходжання. Калі вядомы савецкі гісторык права С. В. Юшкоў першыя прыкметы дзяржаўнасці ў славян адзначае пасля VII ст. н. э., а акадэмік Расійскай акадэміі навук (РАН) Б. Д. Грэкаў «значна раней IX ст.», то акадэмік РАН Б. А. Рыбакоў – намнога раней, недзе на памежжы старой і новай эры. «Не исключена возможность, – пісаў Б.А. Рыбакоў, – что во II-IV веках, до нашествия гуннов (около 375 года), у южной части восточных славян … уже возникла государственность» [2, с.31].

На думку беларускага гісторыка-правазнаўцы Я. А. Юхо, на тэрыторыі Беларусі дзяржава ўзнікла задоўга да нашай эры. На яе рубяжы ішло станаўленне рабаўладальніцкага і адміранне абшчынна-патрыярхальнага ладу. Абодва гэтыя лады працяглы час суіснавалі, дапаўняючы адзін аднаго. Пры гэтым рабаўладальніцкі лад, як і ва ўсёй Усходняй Еўропе, не быў даведзены да яго вышэйшага развіцця (як гэта было ў іншых народаў) і ў X ст. пад нарастаючым уплывам фарміравання феадальных адносін пачаў занепадаць. Беларускі навуковец Г. В. Штыхаў лічыць, што ў VI – VIII стст. у славян (у тым ліку іх этнічных супольнасцей або княжанняў) на тэрыторыі Беларусі: крывічоў (у вярхоўях Дзвіны і Дняпра), дрыгавічоў (паміж Прыпяццю і Дзвіной); радзімічаў (на Сажы) існавала патрыярхальнае рабства. Да гэтага на сучаснай беларускай тэрыторыі родаплемяннное грамадства знаходзілася на стадыі ваеннай дэмакратыі (агульны сход воінаў, савет старэйшын, племянныя правадыры), для якой усё больш тыповым станавіўся пераход да манархічнай формы праўлення.

Апошнім часам беларускія вучоныя пагадзіліся з тым, што пачатак пераходу ўсходніх славян да класавага грамадства на тэрыторыі Беларусі адносіцца да другой паловы 1-га тысячагоддзя нашай эры. На працягу гэтага часу тут устанаўліваюцца шматукладныя сацыяльна-эканамічныя адносіны, развіваецца маёмасная няроўнасць, зараджаецца раннефеадальны ўклад жыцця, які прыкладна ў IX – X стст. становіцца вызначальным. Прычым у пераходны перыяд адначасова існавалі тры грамадскія ўклады: першабытнаабшчынны, рабаўладальніцкі і феадальны. Першы быў аджываючым, другі не атрымаў шырокага распаўсюджання, а трэці вызначаў накірунак эвалюцыі грамадства. У якасці паказчыка даволі высокай ступені грамадскай арганізацыі ў нашых продкаў навукоўцы адзначаюць параўнальна вялікую колькасць гарадоў (пры апісанні падзей XI-XII стст. летапісы згадваюць болей за 35 гарадоў на тэрыторыі сучаснай Беларусі). Па меркаванні вядомага спецыяліста, прафесара БГУ Таісіі Іванаўны Доўнар, узнікненне гарадоў азначала з'яўленне дзяржаў у мініяцюры, паколькі ім былі ўласцівыя асноўныя прыкметы дзяржавы: усталёўвалася публічная ўлада, засноўваліся органы, якія ажыццяўлялі кіруючыя функцыі, збіраліся падаткі і розныя іншыя зборы з насельніцтва. Улада ктраўніцтва гарадоў пашыралася і на пэўнае наваколле.

Узнікненне інстытута дзяржавы было вынікам распаду першабытнага ладу, пераходу ад радавой да суседскай (сельскай) абшчыны, паступовага выдзялення з



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

агульнай масы творцаў прадстаўнікоў адміністрацыйна-класавай сістэмы, спецыялізацыі і канцэнтрацыі вытворчасці, узнікнення гарадоў, неабходнасці абароны зямель ад знешняга ворага. Пры ўзрастанні ролі ўзброенай часткі насельніцтва з найбольш знатных
воінаў фарміравалася прывілеяваная частка грамадства. Сельская абшчына – «мір»,
«вервь» засноўвалася на тэрытарыяльных сувязях, складвалася з асобных «сялянскіх» гаспадарак. Для яе было характэрным спалучэнне калектыўнага уладання зямлёй, раллёй, лясамі і вадаёмамі з індывідуальным (прыватным, сямейным) землекарыстаннем, прыватнай уласнасцю на прадметы працы і на вынікі працы сям'і. Тым самым ствараліся ўмовы для ўзбагачэння асобных сем'яў, старэйшын, военачальнікаў, жрацоў і, нарэшце, для ўзнікнення і развіцця класавага грамадства.

Ужо ў апошняй чвэрці першага тысячагоддзя, адзначаюць аўтары фундаментальнай «Истории белорусской государственности», у славянскіх плямёнаў на тэрыторыі Беларусі «общим в политическом отношении было то, что они находились на пороге государственности и названы в летописи княжениями, во главе которых стояла родоплеменная знать» [3, с.148]. Нарманская экспансія не толькі паскорыла мясцовыя дзяржаватворчыя працэсы, але і прадвызначыла форму раннефеадальнай манархіі як
гістарычна першай формы дзяржаўнасці на нашых землях. Рашаючую ролю інстытуту
«запрашэння на княжанне» ў стварэнні якасна новай сістэмы кіравання ў дзяржаўна-арганізаваным грамадстве ўсходніх славян падкрэсліваў вядомы беларускі тэарэтык права М.У. Сільчанка [4, с.46]. Раннедзяржаўныя структуры (княствы, воласці, пагосты) ствараліся нарманамі шляхам «напластавання» на лакальныя племянныя протадзяржаўныя ўтварэнні [3, с.140], а інстытуты княжацкай улады «наслойваліся» на мясцовыя інстытуты ваеннай дэмакратыі (веча, дума, племянныя цэнтры). Пры гэтым, як піша М.У. Сільчанка, «варагі вымушаны былі прыняць умовы ўсходніх славян «старыны не рушыці», але выкарысталі ў справе пабудовы дзяржавы практычна ўсе свае веды і інстытуты, прынамсі ў арганізацыі вайсковай справы і ажыццяўленні правасуддзя, але вымушаны былі іх, безумоўна, адаптаваць да рэалій жыцця ўсходніх славян» [4, с.48].

З'яўленне ў нашым рэгіёне князёў на чале ўзброеных дружын было адлюстраннем новага грамадскага падзелу працы: вылучаўся слой людзей, якія спецыялізаваліся на прафесіным выкананні функцый публічнай улады. З пераходам да яе дзяржаўнай арганізацыі магчымасці публічнай улады ў параўнанні з уладай племянных правадыроў перыяда ваеннай дэмакратыі значна павялічваліся, што цалкам адпавядала аб'ектыўным патрэбам тагачаснага грамадскага развіцця. Узнікненне дзяржаў-княстваў дазваляла болей эфектыуна вырашаць актуальныя задачы развіцця грамадства, як унутраныя (забеспячэнне парадку ва ўмовах сацыяльнага расслаення, пераадоленне эканамічная ізаляванасці абшчын і населеных пунктаў, стварэнне ўмоў для гандлю і да т.п.), гэтак і знешнія (абарона ад набегаў стэпавікоў-качэўнікаў). Аднак створаныя пры панаванні натуральнай гаспадаркі і замкнёнай эканомікі першыя дзяржаўныя ўтварэнні адрозніваліся ад пазнейшых палітычнай нетрываласцю, неўстойлівасцю, недахопам унутранай кансалідацыі. Гэтыя рысы аб'ектыўна ўласцівыя раннефеадальнай дзяржаўнасці: ў розныя часы і у розных іншых рэгіёнах раннефедальныя утварэнні былі палітычна нетрывалымі, дэманстравалі часовы характар счаплення сваіх тэрытарыяльных адзінак, мелі рухомыя межы (і нават сталіцы!).

На тэрыторыі сучаснай Беларусі такіх невялікіх дзяржаў-княстваў было некалькі дзясяткаў. Найбольш буйнымі сярод іх былі: Полацкае, Тураўскае, Пінскае, Віцебскае, Берасцейскае, Мінскае, Гарадзенскае, Навагародскае, Слуцкае, Мсціслаўскае княствы. Да IX ст. пераважалі асобныя, невялікія па памерах, дзяржавы-княствы. Пазней



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

распачаўся працэс іх аб'яднання ў больш буйныя дзяржаўныя ўтварэнні, які цягнуўся прыкладна да XI ст. Гэтак агульнасць знешнепалітычных інтарэсаў садзейнічала палітычнаму аб'яднанню усходнеславянскіх земляў пад уладаю дынастыі Рурыкавічаў са сталіцай у Кіеве. Аднак гэтая імперыя не была цэнтралізаванай дзяржаваю. Кіеўская Русь ўяўляла сабой палітычнае аб'яднанне феадалаў вакол вялікага князя дзеля адпору набегаў суседніх качавых плямёнаў, здзяйснення рабаўніцкіх паходаў на іншыя землі ды ажыццяўлення бесперашкоднага збору даніны з уласнага насельніцтва. У палітычнай гісторыі беларускіх земляў-княстваў прысутнічаюць перыяды як залежнасці іх, так і незалежнасці ад Кіеўскай Русі. На падставе сацыяльна-эканамічных, сацыяльна-палітычных, знешнепалітычных і іншых прычын княствы аб'ядноўваліся, уступалі ў палітычныя саюзы паміж сабою, а потым зноў раз'ядноўваліся. Сярод іх асабліва вылучалася Полацкае княства, якое у XI-XIII стст. было адной з буйных еўрапейскіх дзяржаў і ў суперніцтве з іншымі ўсходнееўрапейскімі дзяржавамі імкнулася павялічыць сваю тэрыторыю (каля 50 тыс. кв. км.) і міжнародны ўплыў.

Такім чынам, **раннефеадальная дзяржаўнасць на Беларусі стваралася ў кантэксце працэсаў, характэрных для ўсёй Еўропы.** Разнастайныя крыніцы сведчаць: асновы беларускай дзяржаўнасці былі закладзены нашымі продкамі (пераважна ўсходнімі славянамі – крывічамі, дрыгавічамі, радзімічамі і балтамі – літвой, ятвягамі, дайноўцамі) яшчэ да ўтварэння Кіеўскай Русі. **Першыя раннефеадальныя княствы на Беларусі з'яўляюцца вытокам яе дзяржаўнасці, ўвасабленнем ідэі незалежнасці прабеларускага этнасу.** Раней і больш паслядоўна гэтая ідэя праглядвае ў Полацкім княстве, дзе існавала мясцовая дынастыя, за якой прызнаваліся і захоўваліся правы на працягу многіх пакаленняў. Закладзеныя ў старажытных дзяржавах-княствах інстытуты дзяржаўнасці ў спалучэнні з высокім узроўнем развіцця культуры і назапашаным палітычным вопытам станоўча ўздзейнічалі на фарміраванне Вялікага княства Літоўскага.

### Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Конституция Республики Беларусь: с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 нояб. 1996 г., 17 окт. 2004 г. и 27 февр. 2022г. – Минск: Национальный центр правовой информации Республики Беларусь, 2022. – 80 с.

2. Рыбаков, Б. А. Мир истории. Начальные века русской истории. / Б.А. Рыбаков. – М.: Мол. гвардия, 1987. – 351 с.

3. История белорусской государственности. В 5 т. Т. 1: Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. / А. А. Коваленя [и др.]; отв. ред. тома: О. Н. Левко, В.Ф. Голубев; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск: Беларуская навука, 2018. – 598 с.

4. Сільчанка, М. У. Паходжанне дзяржавы і права: вучэб. дапам. / М. У. Сільчанка. – Минск: Тэсей, 2005. – 144 с.

**УДК 341.4+343.1**

***В. И. Самарин***
(*Белорусский государственный университет, Минск*)

## УГОЛОВНО-ПРОЦЕССУАЛЬНАЯ ФОРМА ПОД ВЛИЯНИЕМ МЕЖДУНАРОДНОЙ ПРАВОВОЙ ЗАЩИТЫ

*В публикации предлагается механизм, позволяющий реализовать норму ст. 61 Конституции Республики Беларусь в рамках национального уголовного процесса. Законодателю необходимо предусмотреть в качестве повода для осуществления прокурором проверки по вновь открывшимся обстоятельствам (ст. 420 УПК) непосредственно само*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ